БРЫЛЕЎСКІ ЛЕТАПІС

№ 18 (100)
чэрвень
2009 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца з мая 2006 г.

100

КАЛОНКА РЭДАКТАРА

Дзень добры, шаноўныя чытачы !

У вашых руках чарговы нумар "Брылеўскага летапісу". Але ён не зусім звычайны, бо мае парадкавы № 100. Так-так: у нашага вясковага выдання сёння першы юбілей.

Убачыўшы свет у маі 2006 года, "Летапіс" гэтыя тры гады быў разам з вамі, пільна ўглядаўся ў наша жыццё і ў тыя падзеі, што адбываліся навокал. І са сваіх старонак шчыра распавядаў пра ўсё гэта. Ён знайшоў сяброў і прыхільнікаў не толькі ў нашых вёсках, але і далёка за іх межамі, і тое, што дзееца ў нашых мясцінах, адразу робіцца вядомым і ў Магілёве, і ў Мінску, і ў далёкім замежжы -- у Расіі, Польшчы, Ізраілі, Англіі і Амерыцы. І калісьці хтосьці адтуль пачне нагадваць пра нашае жыццё, -- не здзіўляйцеся, бо аб гэтым яны даведаліся з нашага "Летапісу"...

І няхай леты пішуцца на новых старонках, і няхай не знікае памяць. *Напісанае -- застаецца!*

Ваш Міхась Яцкоў

25 чэрвеня Надзея Піліпаўна БАЯРЧАНКА адзначае 55-годдзе

5 чэрвеня Фёдар Уладзіміравіч МЯШКОЎ адзначае 55-годдзе

15 чэрвеня Аляўціна Мікалаеўна СМЯШКОВА адзначае 45-годдзе

15 чэрвеня Настасся Ўладзіміраўна САЎЧЫНА адзначае 15-годдзе

Нарадзіліся ў чэрвені

1 - Ніна Яфімаўна Мяшкова
1 - Галіна Аляксееўна Пухаленка
3 - Валерый Мікалаевіч Мяшкоў
5 - Ніна Кірылаўна Шведава
7 - Ала Міхайлаўна Яцкова
10 - Уладзімір Аляксеевіч Іваноў
10 - Алег Сяргеевіч Малдаванаў
11- Уладзімір Ільіч Мажораў
11 - Васіль Віктаравіч Іванців
15 - Сяргей Віктаравіч Бірукоў
16 - Мікалай Фёдаравіч Максімчыкаў
17 - Аляксандр Віктаравіч Дубоўскі
18 - Віктар Іванавіч Рамашкевіч *(вул.Юбілейная)*
22 - Міхаіл Аркадзьевіч Масіеўскі
27 - Ганна Іванаўна Бураева
28 - Аляксандр Іванавіч Патоцкі
29 - Ніна Мікалаеўна Бойка
30 - Пётр Уладзіміравіч Капылоў
30 - Канстанцін Уладзіміравіч Іваноў

1 чэрвеня 2009 года у Алесі Уладзіміраўны Аляксейковай і Сяргея Аляксандравіча Кавалёва нарадзілася дачка Аліна.

В і н ш у е м !



Прыдняпроўская НІВА

СЕРАДА 3 ЧЭРВЕНЯ 2009 г. № 42 (8694)

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА МАГІЛЕЎСКАГА РАЁНА

Завершён ещё один учебный год

100

Раённая газета «Прыдняпроўская ніва" 3 чэрвеня 2009 года надрукавала рэпартаж аб апошнім званку ў Кадзінскай школе. Там узгадваюцца і брылеўцы. Прапануем вашай увазе фотаздымак, дзе можна пабачыць нашых хлопцаў і дзяўчат, і фрагмент азначанай публікацыі.

«...Последний звонок. В субботу, 30 мая, он прозвенел для 284-х выпускников 11-х классов нашего района. По особому торжественно и празднично было в Кадинской СОШ. Прекрасное, почти летнее солнце, озаряет школу, нарядных девочек в белоснежных фартуках и бантиках-бабочках, подтянутых ребят. Здесь же заботливые педагоги и родители.

...Вместе с прекрасными пожеланиями хорошего лета и успешной сдачи экзаменов директор УКАП «Фирма «Днепр» В.В.Давыдов вручил отличникам и победителям олимпиад денежные премии. Алина Бедулина, Анастасия Колбик, Варвара Башкирова, Александр Чубуков... Эти ребята на своём первом ответственном этапе в учёбе делают успехи, которыми могут гордиться родители, что приносит славу школе.

...Прощай детство! Вот оно улетает вместе с белыми голубями... А для выпускников звенит последний звонок, который дают ученик 11 класса Александр Чубуков и ученица 1 класса Настя Микулич.

Завершён ещё один учебный год. А жизнь продолжается, и пусть для наших детей она будет наполнена радостью и счастьем».

І Ў БРЫЛЯХ ЗВІНЕЎ ЗВАНОК...

Гэта свята заўсёды з прысмакам суму. Апошні званок і развітанне з роднай школай -- гэта і светлая памяць пра былое, і пытлівы позірк у будучыню...

30 мая 2009 года вучні Брылеўскай пачатковай школы разам з настаўнікамі і бацькамі сабраліся, каб прыгожа адзначыць свята апошняга званка. Дырэктар школы Наталля Анатольеўна Ярмаш павіншавала ўсіх прысутных і зачытала загад аб заахвочванні лепшых вучняў -- Аляксея Аляксейкова, Цімафея Баброва, Карыны Біруковай і Яны Какоўкі. Вітальнае слова прамовіў старшыня выканкама Брылеўскага сельсавета Уладзімір Ільіч Мажораў. А потыя вядучыя свята Яна Какоўка і Аляксей Аляксейкоў павялі прысутных скрозь вясёлыя гульні і займальныя конкурсы. Запомнілася падарожжа ў мінулае, трапіўшы ў якое прысутныя даведаліся, што за гэтыя гады сёняшнія выпускнікі вывучылі 30 правілаў па мове і 60 па матэматыцы, што з'елі яны 4 тоны булачак, патаўсцелі кожны на 25 кг і зараз важуць аж 183 кг.

Класная кіраўніца Тамара Фёдараўна Прунікава з хваляван-

100

нем пажадала сваім вучням вялікіх поспехаў у старэйшых класах Кадзінскай школы. У адказ Антон Трухмінаў, Карына Паршнёва, Надзея Журава, Карына Бірукова і Кірыл Куляшоў падзякавалі сваю першую настаўніцу і паабяцалі няспынна ісці далей да вышынь ведаў.

Ад імя бацькоў выступіла Аксана Міхайлаўна Куляшова. А потым дзетсадаўцы -- будучыя вучні -- павіншавалі сваіх старэйшых таварышаў і ўручылі ім рознакаляровыя паветраныя шарыкі.

І сярэбранае гучанне апошняга званка з рук Карыны Біруковай і Цімафея Баброва разам з развітальнай песняй зрабіліся ўзнёслым завяршэннем гэтага цудоўнага свята.

Ала ЯЦКОВА,
бібліятэкар Брылеўскай бібліятэкі.

Н.А.Ярмаш

Узнагарода К.Біруковай

У.І.Мажораў


Я.Бірукоў

А.Аляксейкоў і Я.Какоўка


Г.Ермалаева

Д.Старс

Першая настаўніца Т.Ф.Прудзікава

Уважлівыя гледачы

А.М.Яцкова

Л.І.Прохарава

100

У.І.Мажораў, Т.Т.Жураўкова, І.Ф.Пракопчык, Т.Я.Фралова, Т.М.Маісеенка

М.М.Бірукова

Я.Пшанічная

Гучыць апошні званок...

Ад імя бацькоў выступае А.М.Куляшова

Фотаздымак на ўспамін:

Наталля Анатольеўна Ярмаш, Уладзімір Ільіч Мажораў, Вераніка Уладзіміраўна Прохарава і Антон Трухмінаў, Раіса Генадзьеўна і Карына Паршнёвы, Жана Уладзіславаўна і Надзея Журавы, Марына Міхайлаўна і Карына Біруковы, Аксана Міхайлаўна і Кірыл Куляшовы, Тамара Фёдараўна Прудніка.

Фота М.Яцкова

ГУМАНІТАРКА.org

100

Урок для старшыні

30 мая 2009 года ў Брылеўскай школе-садзе адбылася сустрэча старшыні выканкама Брылеўскага сельскага Савета Уладзіміра Ільіча Мажорава з настаўнікамі -- жыхарамі в.Брылі. Падчас сустрэчы былі абмеркаваны некаторыя важныя пытанні жыцця нашай вёскі. У прыватнасці, вельмі балючай для жыхароў з'яўляецца праблема прысядзібных участкаў за вуліцай Маладзежнай. Тыя зямельныя надзелы вяскоўцы дзесяцігоддзямі апрацоўвалі, а зараз фірма "Днепр" вырашыла іх забраць пад свае патрэбы. Негледзячы на тое, што і з маючай зямлёй бываюць пэўныя складанасці з апрацоўкай. Навошта забіраць у людзей участкі ля дамоў і адпраўляць іх на нейкія няўдобіцы?.. У. І. Мажораў згадзіўся, што праблема тут існуе, але вырашаць яе трэба агульнымі намаганнямі ўсіх зацікаўленых бакоў.

Ала ЯЦКОВА.

Складаная задачка...

У Т.М.Маісеенка і Т.Т.Жураўковай да старшыні ёсць пытанні...

В.М.Мяшкова ўважліва слухае адказ...

Белорусская НИВА

18.06.2009 г.

На Могилёвщине сокращают количество сельсоветов

Объединение сельских Советов в республике уже осуществляется на практике. Особенно в этом преуспела Витебщина. Теперь инициативу проявила Могилевская область. Дальнейший процесс отложен до осени, когда завершится перепись населения Беларуси. О перспективах объединения и насущных проблемах сельских Советов рассказывает председатель Могилевского областного Совета депутатов Владимир Иванович ПАНТЮХОВ :

-- Экономически целесообразно объединить сельсоветы, в которых количество проживающих людей меньше тысячи. В идеале людей в одном сельсовете меньше трех тысяч быть не должно. Но, начиная объединение, нужно строго следовать правилу -- не навреди. Сегодня из-за огромного количества справок, запросов, отчетов на работу с людьми у председателей зачастую просто не хватает времени. А сокращение сельисполкомов позволит расширить их штат.

В идеале каждый сельчанин, тот же пенсионер, должен иметь возможность легко добираться до сельсовета. Но с точки зрения экономики лучше сельисполкомы упорядочить. Неужели человеку, если будет очень нужно, в хозяйстве не помогут доехать до сельсовета? Да и телефонная связь сейчас везде есть. Звонок председателю — и проблема решена.

В.И.Пантюхов

Наша даведка:

на тэрыторыі Брылеўскага сельсавета сёння пражывае каля 1040 чалавек.

БРЫЛЕЎСКАЯ БІБЛІЯТЭКА ІНФАРМУЕ

100

* * *

Цените дружбу, люди всей планеты,
Цените, кто б её не предлагал.
Лишь верный друг
способен дать ответы
На тот вопрос, что ты не задавал.
Цените чувство вечное, земное,
Не отвергайте дружбу и любовь,
Для всех людей есть правило простое:
Любовь Вы предлагайте вновь и вновь.
Там, где другие Вас уже забыли,
Один друг верный скажет Вам: "Живи",
Какие б неприятности не были,
Не бойтесь, люди, дружбы и любви.

(Невядомы аўтар)

Цытата

Разумны многаму можа навучыцца ў ворага.

Арыстафан (445 – 385 да н.э.), старажытнагрэчаскі паэт-камедыёграф.

Дружебны фактыр

24. 06. 2009 г.

ИММУНИТЕТ ЗАКАЛЯЕТСЯ ДУХОМ И РАСТИТЕЛЬНОЙ ПИЩЕЙ

1. Позитивная цель в жизни.

ЗДОРОВЬЕ и духовность человека взаимосвязаны. Чем выше духовность, тем сильнее иммунитет. Огромную пользу приносит молитва.

Укреплению духа способствует и чёткая постановка цели в жизни. Все проблемы со здоровьем и в личной жизни возникают тогда, когда человек останавливается в развитии. Каждый должен взять ответственность за свой мир. Но цель должна быть благоприятна не только для вас, но и для окружающего мира.

2. Системная очистка организма.

ВРАГ № 1 для организма – его внутренняя загрязнённость. Чтобы он был здоровым, его надо очищать. Лучше всего подходят пост (отказ от животной пищи) и терпение. Старайтесь хотя бы раз в неделю 24-36 часов обходиться без еды и воды. Во время терпения энергия, которая обычно идёт на поглощение, перевариваение и выведение пищи, используется для очищения. Больные клетки разрушаются после 20-го часа, когда организм начинает переходить на внутреннее питание. Для полной очистки необходимо 42 часа. Через 40 часов начинает чиститься мозг. Но для начинающих лучше воздерживаться от пищи и воды начиная с 24 часов.

Хорошо очищает организм вода: 2,5 литра в сутки. Полезно 3 раза в день выпивать медовую воду – чайная ложка мёда на стакан воды. Такой раствор хорошо структурирует воду в организме.

3. Полный отказ от употребления алкоголя, табака, наркотиков.

4. Позитивное отношение между мужчиной и женщиной.

ДЛЯ сохрание семейного счастья супруги в равной степени должны быть грамотными в трёх областях: психологии, физиологии и педагогике.

5. Питание, приближённое к раздельному и вегетарианскому.

ЕСТЬ нужно только в том случае, когда появляется чувство голода. А от перекусов следует отказаться вообще. Механизм, который нейтрализует пищевой комок в нашем организме, включается только через 4 часа после еды. А если мы питаемся чаще, то пища не успевает перевариваться и превращается в шлаки. Необходимо отказаться от еды перед сном, так как после 20.00 клапан, отделяющий пищевод от желудка, закрывается.

Считается, что во время тяжёлой болезни человеку просто необходимо хорошо поесть. Но когда человек себя плохо чувствует, организм нуждается в отдыхе от всего, в том числе и от еды. Во время болезни организм врачует больные места, а пища оттягивает его ресурсы. Поэтому лучше заменить пищу на кислое питьё: вода с добавлением лимонного сока. Кислая среда хорошо подавляет микробы.

Лучше никогда не есть во время, непосредственно до или после серьёзной работы.

Не пить во время еды. Лучше за 10 минут до или через 2 часа после.

Соотношение продуктов: растительные 60% (чем больше в сыром виде, тем лучше), углеводы 25%, белки 20%, жиры – 10%.

Принимать только свежеприготовленную пищу, повторный разогрев делает её мёртвой.

Почему вегетарианство? Это тоже развитие духа – стремление не причинять страдания и смерть живым существам. Кроме того, животные, приговорённые к убою, мучаются всё своё недолгое существование. Их искусственно оплодотворяют, кастрируют, кормят неестественной пищей с добавлением различных гормонов, антибиотиков, а затем везут на смерть. Такие животные находятся в постоянном страхе, и эти отрицательные эмоции передаются потом через мясо.

6. Систематическая физкультура.

ЛУЧШЕ развивать выносливость организма, чем скорость и мышечную массу. Стайер будет наслаждаться физической активностью всю жизнь, спринтер же недолго будет бегать стометровку ради удовольствия. Лучший вид упражнений в преклонном возрасте -- аэробные. Пешие прогулки, спортивный туризм, альпинизм, бег трусцой, бег на месте, плавание, гребля, езда на велосипеде, коньки, занятия на тренажёрах, работа в саду, колка дров. Главное условие – непрерывная активность не менее 20 минут (не менее 4 раз в неделю).

7. Закаливание.

ОБЛИВАНИЕ холодной водой (до 13 градусов) в 2 раза увеличивает биоэлектрическую активность человека. Обливание полезно даже во время болезни. Делать его рекомендуется каждые 2 часа и до тех пор, пока температура не придёт в норму. Выздоровление происходит в течение суток.

Очень полезно ходить босиком.

Валентин ТОЛКАЧЁВ, канд. мед. наук, народный целитель.

Старонку падрыхтавала бібліятэкар Брылеўскай сельскай бібліятэкі Ала ЯЦКОВА

Прозвішча падпісчыка

100

Пра юбілей "Брылеўскага летапісу" - па ОНТ

Добрыя адносіны склаліся паміж “Брылеўскім летапісам” і беларускім тэлеканалам “ОНТ”. 29 мая 2009 года, напярэдадні выхаду ў свет сотага нумара “Летапісу”, у Брылі ў чарговы раз завітала здымачная група гэтага вядомага тэлеканала -- карэспандэнтка Алена Кукшынская і тэлеаператар Уладзімір Недабоеў. Яны зноў здымалі ўвесь тэхналагічны працэс падрыхтоўкі новага нумара, а потым з вялікай цікавасцю працягнулі сваю працу на брылеўскіх вуліцах. Распытвалі вяскоўцаў пра “Летапіс” і атрымлівалі змястоўныя адказы. А паколькі тэлебачанне з’яўляецца магутным сродкам уздзеяння, то жыхары брылеўскай Юбілейнай вуліцы завялі гасцей да рэшткаў сваёй грамадскай лазні і папрасілі агучыць гэтую праблему на ўсю рэспубліку: трэба ж неяк мыцца! А.Кукшынская паабяцала сказаць аб гэтым і абяцанне сваё выканала: 5 чэрвеня паказалі нашу “легенду” ва ўсёй “прыгажосці”. Можа, што і зварухнецца калісьці...

А мы дзякуем “ОНТ” за ўвагу на нашых Брылёў і “Брылеўскага летапісу” і жадаем тэлекампаніі быць заўсёды наперадзе часу.

Мікола ЯЦКОЎ.

Тут пішацца “Летапіс”...

А.Кукшынская.

Уладзімір Недабоеў: -- Ахтунг : міны!!!

У цэнтры ўвагі - В.П.Карочанка.

Вясковая экзотыка.

Спадзяванне...

Размова.

Браты нашы меншыя...

Фотаздымкі Юліі Яцковай

“БРЫЛЕЎСКІ ЛЕТАПІС”
Инфармацыйна-грамадскі бюлетэнь.
Заснавальнік - М.А.Яцкоў
Выдаецца з мая 2006 г.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 100 асобнікаў.

Адказны за выпуск -
Мікалай Адамавіч ЯЦКОЎ
На правах рукапісу.
Пры перадруку матэрыялаў спасылка на “Брылеўскі летапіс” абавязковая.
© “Брылеўскі летапіс”, 2009

Звярстана і надрукавана на прыватным абсталяванні.
Адрас: 213107 Магілёўскі раён, в.Брылі, вул. Юбілейная 6 - 7
тэл. маб. +375293732886
e-mail: brylibelarus@gmail.com